УДК 378.018(476)(09)

**А.А. Гаравая**

# Падрыхтоўка спецыялістаў па завочнай форме навучання ў ВНУ Беларусі
## (другая палова 40-ых – сярэдзіна 50-ых гадоў XX ст.)

Працэс падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўляецца якасным паказчыкам развіцця грамадства. Ва ўмовах развіцця адукацыі і навукі ў рэспубліцы экстэнсіўным шляхам вызначальным фактарам гэтага працэсу з'яўляецца рост грамадскай запатрабаванасці ў выніках адукацыйнай і навуковай дзейнасці. Савецкі ўрад імкнуўся наладзіць працэс навучання ў вышэйшых навучальных установах і атрымаць кваліфікаваных спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці на аснове партыйных прынцыпаў у вырашэнні ўсіх вучэбна-выхаваўчых задач. На сучасным этапе важна прааналізаваць асноўныя падыходы ў працэсе забеспячэння завочнай і вячэрняй адукацыі пасляваеннага перыяду з тым, каб вызначыць перавагі і недахопы савецкай сістэмы падрыхтоўкі кадраў без адрыву ад вытворчасці ў рамках вышэйшай школы праз прызму філалагічнага накірунку, які займае адно з прыярытэтных месцаў у сістэме партыйнай ідэалогіі савецкага грамадства.

Так, у жніўні 1938 года выйшла пастанова СНК СССР «О высшем заочном образовании», дзе прызнавалася неабходнасць падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, ставілася задача павысіць патрабавальнасць да тэарэтычных ведаў студэнтаў-завочнікаў.

У адпаведнасці з пастановай СНК БССР «О восстановлении сети заочного педагогического образования» (1944 год, кастрычнік) аднавілі сваю дзейнасць і завочныя аддзяленні рэгіянальных вышэйшых навучальных устаноў, з агульным кантынгентам на 1944/1945 навучальны год 1300 чалавек [1].

**Сетка завочных аддзяленняў пры педагагічных і настаўніцкіх інстытутах з кантынгентам студэнтаў на 1944/1945 навучальны год**

| Педагагічны інстытут | Кантынгент прыёму | Настаўніцкі інстытут | Кантынгент прыёму |
|---|---|---|---|
| Віцебскі | 150 | Віцебскі | 200 |
| Магілёўскі | 150 | Магілёўскі | 200 |
| Гродзенскі | 150 | Аршанскі | 150 |
| — | — | Пінскі | 150 |
| — | — | Баранавіцкі | 150 |
| Усяго | 450 | Усяго | 850 |

У загадзе Народнага Камісара Асветы БССР «О состоянии заочного обучения при высших педагогических учебных заведениях БССР» (1945 год, красавік) адлюстраваны вынікі 1944/1945 першага пасляваеннага навучальнага года для рэспублікі. Завочным навучаннем у педагагічнай вышэйшай школе ахоплена 3274 чалавекі (з агульнай колькасці 5403 спецыялістаў, занятых у агульнаадукацыйнай сістэме без вышэйшай адукацыі), з якіх прысутнічала на сесіі 2227 чалавек. Адміністрацыя ВНУ максімальна імкнулася наладзіць вучэбны працэс. Аднак, па выніках навучальнага года было адзначана шэраг парушэнняў, якія прысутнічалі на завочных аддзяленнях. Шэраг дысцыплін з-за адсутнасці выкладчыкаў не былі прачытаны, кіраўніцтва ўстаноў не забяспечыла поўную яўку студэнтаў-завочнікаў, у дапамогу студэнтаў не былі арганізаваны бібліятэкі, кансультацыя завочнікаў на месцах (Віцебск, Орша, Магілёў, Пінск, Мазыр), шэраг інстытутаў (Віцебскі, Гродзенскі, Мазырскі) скарацілі тэрмін сесіі з 8 да 5–6 дзён, што прывяло да недавыканання вучэбных планаў [1, ф. 42, воп. 4, спр. 9, арк. 98].

Практычна ў кожным ВНУ прысутнічалі завочныя і вячэрнія аддзяленні філалагічнага накірунку (руская мова і літаратура, беларуская мова і літаратура і падвоеная спецыяльнасць гісторыя і філалогія). Пры гэтым выключная ўвага ў падрыхтоўцы спецыялістаў надавалася рускай мове і літаратуры, а таксама замежным мовам. Перад савецкай дзяржавай стаяла задача падрыхтоўкі вопытных спецыялістаў дадзенага профілю, якія б змаглі працаваць у сістэме адукацыі краін сацыялістычнага лагера. З мэтай павышэння эфектыўнасці завочнага навучання настаўнікаў выйшаў загад па Народнаму Камісарыяту Асветы БССР «О заочном обучении учителей» (1946 год, сакавік), па якому ўстанаўліваліся тэрміны навучання на завочных аддзяленнях універсітэта – 6 год, педагагічных інстытутаў – 5 год, настаўніцкіх інстытутаў – 4 гады [1, ф. 42, воп. 4, спр. 19, арк. 93].

У 1945/1946 навучальным годзе колькасць студэнтаў завочнага аддзялення складала 4,3 тысячы чалавек, у 1950/1951 навучальным годзе – 11,4 тысячы чалавек, а ў 1960/1961 навучальным годзе – 21,5 тысячы чалавек. Аднак у многім – гэта быў колькасны паказчык, таму што існавала шмат нявырашаных праблем метадычнага і навучальнага характару, якія стаялі перад завочным аддзяленнем. Практычна ва ўсіх ВНУ, дзе было завочнае аддзяленне, не хапала вучэбнай літаратуры, як вынік – вельмі нізкі ўзровень ведаў студэнтаў-завочнікаў на сесіях.

Ва ўмовах аднаўлення народнай гаспадаркі дзяржаўны апарат адчуваў недахоп у кваліфікаваных кадрах, таму выйшла пастанова Савета Міністраў СССР «О заочной подготовке специалистов» (1946 год, красавік). Згодна з пастановай, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў павінны былі вызваляць студэнтаў ад працы ўвечары, даваць адзін вольны дзень у тыдзень без захавання заработнай платы, своечасова даваць дазвол на вучэбныя адпачынкі з мэтай здачы сесіі. Бібліятэкі прадпрыемстваў і ўстаноў павінны былі набы-

ваць вучэбную літаратуру для карыстання студэнтамі завочнага і вячэрняга навучання. Пастанова ў рэальным жыцці мела фармальны характар, бо штогадовы аналіз завочных аддзяленняў на ўзроўні міністэрства выяўляў адны і тыя ж праблемы. Студэнты-завочнікі адводзілі на самастойную работу ў два разы менш часу. Самастойная работа здзяйснялася толькі ў міжсесійны перыяд у форме кантрольных і курсавых работ (прычым, дзяржава забяспечвала сшыткамі з разліку 15 штук на аднаго студэнта-завочніка ў год). Па колькасці гадзін аб'ектыўна студэнты-завочнікі адчувалі дэфіцыт у курсах лекцыйных і практычных заняткаў. Сесіі праходзілі ўсяго два тыдні, і за гэты час практычна не магчыма было абгрунтавана правесці выкладанне курса. Як вынік, веды студэнтаў-завочнікаў характарызаваліся ізаляванасцю ад навуковай рэчаіснасці, слабай навуковай і тэарэтычнай базай. Як адзначыў І.М. Ільюшын (загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б): «...У завочным навучанні ёсць негатыўны стэрэатып – на чалавека, які закончыў завочную вучэбную ўстанову, глядзяць як на непаўнацэннага супрацоўніка» [1, ф. 42, воп. 4, спр. 67, арк. 144].

Каб прыцягнуць большую колькасць грамадзян рэспублікі атрымаць вышэйшую адукацыю без адрыву ад вытворчасці, выйшаў загад «О приеме на заочное отделение пединститутов» (1946 год, красавік). У адпаведнасці з загадам без уступных экзаменаў прымалі асоб, якія мелі дыплом аб сканчэнні настаўніцкіх інстытутаў і залічвалі на III курс завочных аддзяленняў педінстытутаў. Такім чынам, прадугледжваецца пераемнасць у атрыманні вышэйшай адукацыі [2, 3].

Працэс аднаўлення сістэмы завочнага навучання рэспублікі можна разгледзець больш падрабязна на прыкладах Мінскага і Гродзенскага педагагічных інстытутаў як вядучых навучальных устаноў БССР.

З ліпеня 1944 года аднавіў сваю дзейнасць Мінскі педагагічны інстытут імя Горкага як адна з вядучых педагагічных устаноў рэспублікі. У яго складзе аднавіла сваю дзейнасць завочнае аддзяленне ў складзе аддзяленняў: мовы і літаратуры (рускае і беларускае аддзяленні), гістарычнае, гісторыка-філалагічнае [1, спр. 1507, арк. 13]. У адпаведнасці з распараджэннямі савецкага ўрада аб павелічэнні колькасці спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй Міністэрства асветы БССР выдала загад аб адкрыцці з 10 мая 1949 года завочнага аддзялення пры Мінскім педагагічным інстытуце замежных моў з кантынгентам прыёму на першы курс 150 чалавек, у тым ліку: на аддзяленне нямецкай мовы – 90 чалавек, французскай мовы – 30, англійскай мовы – 30 чалавек [1, ф. 42, воп. 4, спр. 51, арк. 97].

Гродзенскі педагагічны інстытут – як цэнтр падрыхтоўкі педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі заходніх абласцей БССР – пачаў сваю дзейнасць у 1944/1945 навучальным годзе праз дзённую і завочную формы навучання. На завочным аддзяленні падрыхтоўка вялася па трох спецыяльнасцях: беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, фізіка і матэматыка. Кантынгент студэнтаў-завочнікаў склаў 150 чалавек, што адпавядала колькасці па іншых інстытутах рэспублікі.

У 1947 годзе на базе Гродзенскага педагагічнага інстытута адкрыта вячэрняя форма навучання, дзе рыхтаваліся спецыялісты рускай мовы і літаратуры і замежных моў (англійская і нямецкая). Усяго навучалася на першым курсе 49 студэнтаў, у тым ліку па спецыяльнасці «Руская мова і літаратура» – 22 і па спецыяльнасці «Замежная мова» – 27 [4]. Як адзначаецца ў афіцыйных справаздачах, з усіх спецыяльнасцей найбольш значныя недаборы прысутнічалі на фізіка-матэматычным факультэце і факультэце замежных моў, што можна патлумачыць спецыфікай прадметаў.

Працэс аднаўлення сістэмы завочнай адукацыі праходзіў у складаных умовах: адсутнічалі аўдыторыі, не хапала кваліфікаваных кадраў, практычна ўся метадычная і вучэбная база была знішчана ў перыяд вайны, выкладчыкі былі перагружаны і не маглі ў поўным аб'ёме выкладаць дысцыпліны. Нездавальняючыя тэарэтычныя веды студэнтаў можна патлумачыць амаль пазаконкурснай асновай пад час прыёму на завочныя аддзяленні і парушэннем адміністрацыяй ВНУ статута вышэйшай школы пры пераводзе студэнтаў-завочнікаў на другі курс са шматлікімі акадэмічнымі запазычанасцямі [1, ф. 42, воп. 4, спр. 30, арк. 175]. Вынікі вучэбнай дзейнасці завочных аддзяленняў ВНУ БССР адлюстраваны ў табліцы.

**Вынікі летняй сесіі на завочных аддзяленнях педагагічных ВНУ БССР за 1946/1947 навучальны год**

| ВНУ | Колькасць усяго на 1947 год | План набору | Прынята | З'явілася на сесію | Выканала вучэбны план |
|---|---|---|---|---|---|
| Мінскі педінстытут | 905 | 300 | 209 | 635 | 354 |
| Гомельскі педінстытут | 1020 | 300 | 213 | 738 | 360 |
| Магілёўскі педінстытут | 862 | 275 | 257 | 640 | 282 |
| Віцебскі педінстытут | 545 | 250 | 202 | 456 | 150 |
| Гродзенскі педінстытут | 203 | 125 | 71 | 190 | 102 |
| Аршанскі наст. інстытут | 391 | 90 | 101 | 294 | 97 |
| Мазырскі наст. інстытут | 247 | 90 | 102 | 206 | 71 |
| Баранавіцкі наст. інстытут | 291 | 90 | 90 | 281 | 71 |
| Брэсцкі наст. інстытут | 82 | 90 | 35 | — | — |
| Пінскі наст. інстытут | 191 | 90 | 100 | 137 | 81 |
| **УСЯГО** | **4737** | **1700** | **1380** | **3626** | **1568** |

У першыя пасляваенныя гады конкурсная аснова на завочныя аддзяленні практычна адсутнічала. З сакавіка 1948 года, па загадзе Міністэрства асветы БССР, завочнае аддзяленне Брэсцкага настаўніцкага інстытута, з-за недастатковага кантынгенту завочнікаў, было пераведзена ў Баранавіцкі і Пінскі настаўніцкія інстытуты [1, ф. 42, воп. 4, спр. 41, арк. 68]. Па плане пятай пяцігодкі (1951–1955 гг.) у краіне планаваўся далейшы ўздым галін народнай гаспадаркі і, адпаведна, далейшае развіццё вышэйшай школы.

Дзяржаўная палітыка ў галіне вышэйшай адукацыі, у тым ліку завочнай і вячэрняй, была накіравана на колькаснае павелічэнне спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Міністэрствам асветы БССР былі прааналізаваны недахопы ў падрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў для агульнаадукацыйных школ. Так, у прыватнасці, педагагічныя і настаўніцкія інстытуты будаваліся і пашыраліся без уліку неабходных для працы ўмоў: не хапала вучэбных плошчаў і інтэрнатаў, тэхнічнае абсталяванне не адпавядала нормам вышэйшых навучальных устаноў, вострай была кадравая праблема прафесарска-выкладчыцкага саставу ВНУ.

З улікам таго, што наборы студэнтаў у канцы 40-ых – 50-ых гг. XX ст. не рэгуляваліся Міністэрствам асветы ў адпаведнасці з запатрабаваннямі ўстаноў у спецыялістах, адбылося перанасычэнне кадраў гістарычнага, геаграфічнага і філалагічнага накірункаў, што прывяло да неабгрунтаванага скарачэння завочных аддзяленняў у межах вышэйшых навучальных устаноў. У канцы 40-ых – пачатку 50-ых гадоў набор студэнтаў на завочныя аддзяленні вышэйшых навучальных устаноў практычна выконваўся толькі за кошт гуманітарных спецыяльнасцей. Так, гістарычнае аддзяленне перавыканала план на 32%, мовы і літаратуры – на 0,6%, аднак недавыканалі план замежнае аддзяленне – на 19%, матэматыка – на 37% [1, ф. 7, воп. 4, спр. 1865, арк. 1].

**Даведка ад выкананні плана набора студэнтаў-завочнікаў у педагагічныя інстытуты па спецыяльнасцях за перыяд 1949–1952 гг.**

| Навуч. год | План набору | Выка-нана | Па спецыяльнасцях | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | гісторыя | | мова і літаратура | | замежная мова | | матэматыка | |
| | | | план | вык. | план | вык. | план | вык. | план | вык. |
| 1949–1950 | 1125 | 921 | 100 | 131 | 475 | 364 | 150 | 137 | 300 | 204 |
| 1950–1951 | 1000 | 966 | 100 | 129 | 375 | 462 | 150 | 115 | 300 | 211 |
| 1951–1952 | 1000 | 988 | 100 | 137 | 375 | 406 | 175 | 129 | 350 | 185 |

Да 1955 года былі зачынены дзённыя і завочныя аддзяленні Магілёўскага, Бабруйскага, Пінскага, Віцебскага, Гомельскага, Брэсцкага, Аршанскага, Баранавіцкага і Маладзечанскага настаўніцкіх інстытутаў, як прамежкавы тып паміж вышэйшымі і сярэднімі педагагічнымі ўстановамі.

Міністэрства асветы БССР імкнулася ў кароткія тэрміны наладзіць дзейсную сістэму кваліфікацыі кадраў Народнай асветы рэспублікі. Для педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў з 1948 года ўсталявалася адзіная сістэма кваліфікацыі кадраў Народнай асветы, якая ўключала ў сябе завочнае навучанне (педагагічнае вучылішча – 4 гады, настаўніцкі інстытут – 3 гады, педагагічны інстытут – 5 год); сістэму аднагадовых (для настаўнікаў) і двухгадовых для (кіруючых кадраў) вочна-завочныя заняткі і курсы для асоб, якія маюць педагагічную адукацыю і педагагічны стаж да 15 год; самастойную працу, семінары і практыкумы – для настаўнікаў з педагагічным стажам больш за 15 год [3, спр. 16, арк. 292].

Відавочна, што арганізацыя і правядзенне вучэбнага працэсу са студэнтамі-завочнікамі з'яўляецца больш складаным, чым на стацыянары. У сувязі з гэтым важнае значэнне набывае пытанне забеспячэння завочных аддзяленняў высокакваліфікаванымі кадрамі выкладчыкаў. Вучэбны працэс

дзеліцца на вучэбна-экзаменацыйныя сесіі і перыяд межсесійнай самастойнай працы студэнтаў-завочнікаў. Час сесіі завочных аддзяленняў вельмі кароткі (да двух тыдняў). Асноўная праца па выкананні вучэбнага комплексу прадметаў ВНУ здзяйснялася студэнтамі-завочнікамі ў міжсесійны перыяд, але па прычыне вялікай нагрузкі на асноўным месцы працы будучыя кваліфікаваныя спецыялісты не мелі магчымасці якасна рыхтавацца.

Пад час правядзення заняткаў на завочных і вячэрніх аддзяленнях улічваліся наступныя фактары, якія вызначалі яго асаблівасці: спецыфіка вучэбнага прадмета «Замежная мова», кантынгент студэнтаў. З гэтага вынікаюць асноўныя патрабаванні да заняткаў па вывучэнні замежнай мовы – практычная накіраванасць, комплекснасць (на занятках вывучаюцца розныя аспекты мовы – фанетыка, лексіка, граматыка), адзінства практычных і выхаваўчых мэт навучання, улік уплыву роднай мовы. З вучэбнага плана па спецыяльнасці «Замежная мова» на 1947 год, відавочна, што асноўны упор пры вывучэнні замежнай мовы прыпадае на практычны курс, што не дазваляе стварыць моцную тэарэтычную базу ведаў студэнтаў [1, ф. 42, воп. 4, спр. 30, арк. 232].

| Дысцыпліны | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | Усяго | Лекцыі | Практыч. заняткі |
| Фанетыка | 289 | 19 | 289 |
| Граматыка | 301 | 68 | 301 |
| Лексіка і пераклад | 905 | – | 905 |
| Лексікалогія | 34 | 30 | 4 |
| Стылістыка | 36 | 26 | 10 |
| Агульны пераклад | 93 | – | 93 |
| Гісторыя мовы | 38 | 38 | – |
| Другая замеж. мова | 125 | – | 125 |

У 1954 годзе выйшаў загад Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР «Мероприятия по развитию и улучшению заочного и вечернего высшего и среднего специального образования», згодна з загадам Міністэрства вышэйшай адукацыі дадзена права адчыняць вучэбна-кансультацыйныя пункты пры наяўнасці 200 студэнтаў-завочнікаў. У працяг у лютым 1956 года міністр вышэйшай а дукацыі СССР выдаў загад «О мерах по дальнейшему улучшению заочного обучения в высшей школе». З мэтай пашырэння завочнага навучання і павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці кіраўнікам галоўных упраўленняў загадвалася прымацаваць тэрмінам у адзін месяц завочныя аддзяленні стацыянарных ВНУ да адпаведных завочных інстытутаў для пастаяннага забеспячэння аддзяленняў навукова-метадычнай літаратурай. Перад уступнымі экзаменамі на завочныя аддзяленні неабходна праводзіць шырокую тлумачальную работу сярод працуючых для забеспячэння конкурсу на ўступных экзаменах. Пры паступленні ў абітурыента абавязкова павінен быць стаж работы не менш за тры гады. Адміністрацыі ВНУ праз Саветы навучальнай установы кожны год неабходна кантраляваць на прадмет працы студэнта-завочніка.

У адпаведнасці з увядзеннем у жыццё Закону аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР Савет Міністраў СССР у ліпені 1959 года выдае пастанову «О льготах для студентов вечерних и заочных вузов и учащихся вечерних и заочных средних специаль-

ных учебных заведений», у якой прадугледжваюцца шэраг эканамічных ільгот для студэнтаў завочнага і вячэрняга навучання. Так, даецца 20 каляндарных дзён водпуску на перыяд здачы сесіі з захаваннем заработнай платы, праезд студэнтаў-завочнікаў для здачы сесіі, лабараторных работ, абароны дыпломнага праектавання, якія на 50% аплочваюцца прадпрыемствам ці ўстановай, дзе працуе студэнт, дазваляецца прадпрыемствам прадастаўляць па жаданні студэнтаў адзін – два вольныя дні ў тыдзень без захавання заработнай платы.

Падрыхтоўка кадраў без адрыву ад вытворчасці ў цэлым сябе апраўдала і адыграла значную ролю ў забеспячэнні народнай гаспадаркі, навукі і культуры БССР кваліфікаванымі спецыялістамі.

У пасляваенны перыяд падрыхтоўка спецыялістаў на завочных і вячэрніх аддзяленнях праходзіла на вельмі нізкім навукова-метадычным узроўні. У працэсе аднаўлення сеткі завочных і вячэрніх ВНУ вельмі востра стаяла кадравае пытанне выкладчыкаў. Урад рэспублікі трымаў пад сваім кантролем пытанне аднаўлення ўсей сістэмы адукацыі, і завочнага ў прыватнасці. Рацыянальнасць у падрыхтоўцы спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці павінна забяспечвацца з улікам запатрабаванасці грамадскасцю і дастатковай наяўнасці выкладчыцкай і метадалагічна-тэарытычнай баз. Аднаўленне сеткі завочных і вячэрніх аддзяленняў пры ВНУ савецкага грамадства ў другой палове 40-ых – 50-ых гг. ХХ ст. ішло ў шырыню, што вяло да экстэнсіфікацыі ведаў будучых спецыялістаў.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***УНАРБ.*** Ф. 7, воп. 3, спр. 23, арк. 51–54.
2. ***Высшая школа:*** Сб. основных постановлений, приказов и инструкций: в 2 ч. / Под ред. ***Е.И. Войленко***. – М., 1978. – Ч. 1. – С. 399.
3. ***УДАВВ.*** Ф. 204, воп. 10, спр. 50, арк. 3.
4. ***Габрусевіч С.А., Крэнь І.П.*** Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы. Гістарычны нарыс. – Гродна, 2001. – С. 48.



## *SUMMARY*

*The author of the article considers the restoration of the network of education by correspondence in higher educational establishments of the BSSR within the years of 1944–1956. The article also deals with training specialists in the humanities without their quitting jobs. The research highlights the impact of the party guidance on the functioning of correspondence departments in higher educational establishments.*


*Поступила в редакцию 24.03.2006*